ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення культуры
Гродзенскага аблвыканкама
А.В. Клімовіч
19 студзеня 2024 г.

ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення
абласной выстаўкі-конкурсу
дэкаратыўна-прыкладнога і
выяўленчага мастацтва "Вечна жыві і
квітней, Беларусь" да 80-годдзя
вызвалення Беларусі ад нямецка-
фашысцкіх захопнікаў

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласной выстаўкі-конкурсу дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва "Вечна жыві і квітней, Беларусь" да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (далей – Выстаўка-конкурс).

2. Мэтамі і задачамі Выстаўкі-конкурсу з'яўляюцца: яскравае раскрыццё сродкамі дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва існасці гісторыка-культурных каштоўнасцей Беларусі; папулярызацыя беларускай нацыянальнай культуры; фарміраванне ідэйна-мастацкага ўзроўню і эстэтычнага густу; выяўленне і падтрымка таленавітых дзяцей і моладзі ў розных відах і жанрах народнай творчасці, рэалізацыя іх творчага патэнцыялу.

3. Арганізатарамі Выстаўкі-конкурсу з'яўляюцца: упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама, ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" (далей Гродзенски АМЦНТ) (дадатак 1).

4. Пры арганізацыі, падрыхтоўцы і правядзенні Выстаўкі-конкурсу арганізатары і ўдзельнікі кіруюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і сапраўднай Інструкцыяй.

5. У Выстаўцы-конкурсе прымаюць удзел дарослыя майстры народнай творчасці і мастакі; дзеці, падлеткі, моладзь – удзельнікі гурткоў і студый выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, вучні дзіцячых мастацкіх школ і школ мастацтваў, навучэнцы каледжаў, студэнты вышэйшых навучальных устаноў; асобныя творцы.

6. Выстаўка-конкурс праводзіцца ў два этапы: 1 этап (адборачны) – адбор работ канкурсантаў па фотаздымках да 20 красавіка 2024 г.; 2 этап (заключны) – праводзіцца з 30 красавіка па 14 жніўня 2024 г. у ДУК "Гродзенскі АМЦНТ".

7. Узнагароджванне пераможцаў Выстаўкі-конкурсу адбудзецца 3 ліпеня 2024 г. у г. Гродна падчас правядзення мерапрыемстваў да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

8. У выпадку пераносу тэрміна ўзнагароджвання пераможцаў Выстаўкі-конкурсу ці яго адмены па аб'ектыўных прычынах удзельнікі будуць апавешчаны індывідуальна.

9. Конкурс праводзіцца па намінацыяі "дэкаратыўна-прыкладное і выяўленчае мастацтва".

10. Вынікі Выстаўкі-конкурсу журы (дадатак 2) падводзіць асобна.

11. У намінацыі вылучаюцца пераможцы ў 3-х узроставых катэгорыях:

малодшая (дзеці да 13 гадоў)*;

сярэдняя (ад 14 да 17 гадоў)*;

дарослая (ад 18 гадоў і старэйшага ўзросту).

* узрост удзельнікаў вызначаецца на дату правядзення Выстаўкі-конкурсу

12. Пераможцы выстаўкі-конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі лаўрэата (I, II, III ступені) у рамках і прызамі.

13. Дадаткова журы ўзнагароджвае канкурсантаў таксама спецыяльнымі прызамі і дыпломамі ў рамках: "за прапаганду гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі"; "за адлюстраванне агульнабеларускіх каштоўнасцей нацыянальнай культуры"; "за крэатыўнае мастацкае мысленне"; "за інтэрпрэтацыю народных традыцый"; "за глыбіню вобразнага раскрыцця тэмы".

14. Усе астатнія ўдзельнікі Выстаўкі-конкурсу ўзнагароджваюцца электроннымі дыпломамі за ўдзел.

15. Па ўзгадненні з аргкамітэтам журы мае права пры адсутнасці конкурсу ў адной з намінацый ці катэгорый аб'ядноўваць іх ці ўводзіць дадатковыя намінацыі ў рамках выдзеленага прызавога фонду Выстаўкі-конкурсу, падзяляць лаўрэацкія месцы і вызначаць дадатковыя спецыяльныя прызы, не прысуджаць званні лаўрэатаў.

16. Рашэнне членаў журы па выніках Выстаўкі-конкурсу фіксуецца ў пратаколе (падпісваюць усе члены журы), які размяшчаецца не пазней 10 каляндарых дзён з дня правядзення мерапрыемства на афіцыйным сайце ДУК "Гродзенскі АМЦНТ".

17. Рашэнне журы з'яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

18. Для ўдзелу ў 1 этапе Выстаўкі-конкурсу неабходна да 20 красавіка 2024 года даслаць агульны спіс удзельнікаў ад раёна (г. Гродна), заяўкі на кожнага ўдзельніка асобна (дадатак 3) на электронны адрас ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці", з адзнакай Выстаўка-конкурс info@gromc.by.

19. Агульная колькасць заявак ад кожнага раёна па ўсіх намінацыях не больш 7.

20. Кожны канкурсант можа прадставіць не больш 2 выставачных работ.

21. Аргкамітэт адбірае работы канкурсантаў і індывідуальна паведамляе іх.

22. Для ўдзелу ў 2-ім этапе канкурсантам неабходна прадставіць работы да 30 красавіка 2024 года па адрасе: г. Гродна, вул. Савецкая, 8, ДУК "Гродзенскі АМЦНТ", кантактныя тэлефоны: +375 152 623803, 623792, 623798.

23. Конкурсныя работы, прадстаўленыя на Выстаўку-конкурс. павінны быць выкананы ў адпаведнасці з кампазіцыйнымі асаблівасцямі, быць творчымі і арыгінальнымі ў тэматычным плане, мець яркае і выразнае раскрыццё вобразаў.

24. Прадстаўленыя на Выстаўку-конкурс работы неабходна суправадзіць тлумачальнай запіскай з указаннем назвы работы; прозвішча, імя, імя па бацьку; узросту аўтара; матэрыялу і тэхнікі выканання работы; поўнай назвы ўстановы, якая прадстаўляе канкурсанта; кароткім апісаннем ідэйна-сюжэтнай канцэпцыі і інш.

25. Камандзіровачныя і транспартныя выдаткі па дастаўцы выставачных работ ажыццяўляюцца за кошт накіроўваючай арганізацыі.

26. Фінансаванне абласной Выстаўкі-конкурсу ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК "Гродзенскі АМЦНТ" на цэнтралізаваныя мерапрыемствы.

27. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: набыццё прызоў, спецыяльных прызоў, выраб дыпломаў.

28. Для фінансавання абласной Выстаўкі-конкурсу могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Дадатак 1
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласной выстаўкі-конкурсу дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва "Вечна жыві і квітней, Беларусь" да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

СКЛАД АРГКАМІТЭТА
выстаўкі-конкурсу дэкаратыўна-прыкладнога і
выяўленчага мастацтва "Вечна жыві і квітней, Беларусь"
да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

| | |
|---|---|
| Клімовіч А.В. | начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *старшыня аргкамітэта;* |
| Пекар А.Ю. | галоўны спецыяліст аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных устаноў Гродзенскага аблвыканкама, *сустаршыня аргкамітэта;* |
| Хільмончык К.В. | дырэктар ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці", *намеснік старшыні аргкамітэта;* |
| Барысевіч Я.А. | вядучы метадыст ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці"; |
| Рамановіч Н.І. | намеснік дырэктара ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці"; |
| Пятрук А.П. | вядучы метадыст ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці"; |
| Шлавянец В.Ф. | загадчык аддзела ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці". |

Дадатак 1
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласной выстаўкі-конкурсу дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва “Вечна жыві і квітней, Беларусь” да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

СКЛАД ЖУРЫ
выстаўкі-конкурсу дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва “Вечна жыві і квітней, Беларусь” да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

| | |
|---|---|
| Куратчык С.В. | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *старшыня журы;* |
| Рамановіч Н.І. | намеснік дырэктара ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”, *намеснік старшыні журы;* |
| Барысевіч Я.А. | вядучы метадыст па выяўленчаму і дэкаратыўна-прыкладному мастацтву ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Бандарэнка М.Т. | мастак, член Гродзенскага абласнога аддзялення “Саюз мастакоў Беларусі”; |
| Пекар А.Ю. | галоўны спецыяліст аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных устаноў Гродзенскага аблвыканкама; |
| Пятрук А.П. | вядучы метадыст па народных промыслах ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Шлавянец В.Ф. | загадчык аддзела традыцыйнай мастацкай культуры ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Шунейка А.Ф. | метадыст ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”. |

Дадатак 2
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласной выстаўкі-конкурсу дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва “Вечна жыві і квітней, Беларусь” да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік (загадчык) аддзела (сектара) культуры гар(рай)выканкама

## ЗАЯЎКА
на ўдзел у абласной выстаўцы-конкурсе дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва “Вечна жыві і квітней, Беларусь” да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

1. Намінацыя ______________________________
2. Прозвішча, імя, імя па бацьку ўдзельніка __________________
3. Колькасць прадстаўленных работ ____________________
4. База дзейнасці ____________________________
5. Дата нараджэння, узроставая катэгорыя __________________
6. Кантактны тэлефон __________________________
7. Работы, прадстаўленыя на выстаўку-конкурс:

| № | Назва работы | Тэхніка выканання |
|---|---|---|
| 1 | | |
| 2 | | |
| 3 | | |

8. Кароткае апісаннем ідэйна-сюжэтнай канцэпцыі работ ______________________________

Кіраўнік базавай установы ______________________________
(подпіс з расшыфроўкай)

*** Заяўка дасылаецца ў фармаце word і pdf з абавязковым фота работ**